КОСМАС УНУТРЫ КОЖНАГА 8

СПАЛУЧАЮЧЫ ТРАДЫЦЫІ З СУЧАСНАСЦЮ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 ЧЭРВЕНЯ 2022 г. СУБОТА № 123 (29745)

ЦЫТАТА ДНЯ

Вольга РУСІНОВІЧ, дырэктар Дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі:

«Паняцце «жаночае прадпрымальніцтва» замацавалася ў эканамічным жыцці беларускай супольнасці. Можна сказаць, што ў апошняе дзесяцігоддзе сфарміраваўся пэўны трэнд у прадпрымальніцкім асяроддзі. У Беларусі высокая занятасць жанчын, у іх яскрава праяўляецца імкненне атрымліваць адукацыю і прафесійна расці. Практычна кожны трэці прадпрымальнік у нас у краіне — жанчына, прычым у асноўным гэта ІІІ. Разам з тым існуе псіхолага-матывацыйны фактар, які стрымлівае развіццё прадпрымальніцкай ініцыятывы жанчын. Размова ідзе аб унутранай гатоўнасці. Жанчыны менш схільныя да рызыкі, а значыць, больш маюць патрэбу ў пазітыўных прыкладах самарэалізацыі ў бізнесе».

МОЛАДЗЬ БЕЛАРУСІ — НАЙЛЕПШАЯ НА ЗЯМЛІ

Дарагія юнакі і дзяўчаты!

Ад усёй душы віншую вас з Днём моладзі і студэнцтва — святам, якое ўвасабляе мару, мэтанакіраванасць, энергію і аптымізм.

Я ведаю, моладзь Беларусі — найлепшая на зямлі. Разумныя і таленавітыя, поўныя яркіх ідэй і грандыёзных планаў, вы знаходзіцеся ў самым пачатку вялікага жыццёвага шляху. Гэты шлях стане лагічным працягам працы многіх пакаленняў.

Вашы дзяды і прадзеды абаранялі Айчыну, каб вы сёння жылі пад мірным небам. Мы рабілі і робім усё магчымае, каб вы раслі і сталелі ў незалежнай і моцнай дзяржаве. Захоўвайце гістарычную памяць, шануйце культурныя і духоўныя традыцыі беларускага народа.

З кожным годам ваша роля ва ўсіх сферах жыцця грамадства — эканомікі, навукі, палітыцы і культуры — будзе ўзрастаць. Заўсёды памятайце: вучоба і праца, павага да старэйшых і любоў да Радзімы — вывераная формула, якая прынясе вам шчасце, а нашай любімай Беларусі — росквіт.

У гэты святочны дзень я жадаю вам моцнага здароўя, дабрабыту, яркіх перамог і высокіх дасягненняў.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота Прэзідэнта ГОЛАД.

КАРАТКА

- **Краіны АДКБ маюць намер правесці тэхнічную трэніроўку па камп'ютарнай бяспецы.**
- Сярэдняя зарплата ў Беларусі ў маі склала Br1573,4.
- **Бацькі з 2023 года змогуць падаць анлайн-заяўку на месца ў дзіцячым садку.**
- У Беларусі ў 2021 годзе выкананы 484 трансплантацыі органаў.
- **Выпуск на рынак беларускай вакцыны ад COVID-19 плануецца ў канцы 2023 года.**

Вёска будучыні

ЦІ ЗАМЕНІЦЬ РОБАТ МЕХАНІЗАТАРА

На гэту і іншыя абстрагаваныя тэмы паразважаў разам з карэспандэнтам «Звязды» кіраўнік «Горацкага элеватара»

Пётр ПАНАСЮГА — асоба, вядомая не толькі на Магілёўшчыне. Яго імя звязана з Беларускай сельскагаспадарчай акадэміяй, што ў Горках, дзе ён 35 гадоў выкладаў, арганізаваў кафедру «тэхналогіі захавання і перапрацоўкі раслінай сыравіны» і быў першым яе загадчыкам. А яшчэ — з Дрыбінскім раёнам, які некалькі гадоў узначальваў. Ён не проста кіраўнік вядучага ў Горацкім раёне аграпрадпрыемства, але і навуковец, рацыяналізатар. «Горацкі элеватар», дарэчы, сёння з'яўляецца навукова-практычнай пляцоўкай для акадэміі. Тут ад яе працуе чатыры філіялы, каля тысячы студэнтаў штогод праходзяць практыку і павышаюць узровень сельскагаспадарчых ведаў. Сёння мы з кіраўніком «Горацкага элеватара» размаўляем пра работу ва ўмовах санкцый, курс на высокатэхналагічнае развіццё і шляхі вырашэння пытання з кадрамі.

СТАР. 7

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на ІІІ квартал і ІІ паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«МЫ ВЫЙДЗЕМ НА ТОЙ УЗРОВЕНЬ СУПРАЦОЎНІЦТВА І РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСІ І РАСІІ, НА ЯКІМ МЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ»

Учора падчас працоўнага візіту ў Расію Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Санкт-Пецярбурга Аляксандрам Бягловым.

«Для нас Піцер з'яўляецца адным з асноўных напрамкаў работы ў Расійскай Федэрацыі. Мы будзем рабіць усё для таго, каб гэту вялізную расійскую пляцоўку не страціць. У нас добра развіваецца тавараабарот, мы можам прыбавіць. Асабліва ўлічваючы тыя паводзіны заходніх партнёраў, як прынята гаварыць. Думаю, што на працягу гэтага і наступнага года мы выйдзем на той узровень супрацоўніцтва і развіцця Беларусі і Расіі, на якім мы павінны быць. Мы пераадолеем усе нягоды і перашкоды, асабліва ў эканоміцы», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў Беларусі поўныя рашучасці супрацоўнічаць з Санкт-Пецярбургам па ўсіх напрамках: «Ад ліфтаў да камунальнай тэхнікі, якая сёння патрэбна. Але галоўнае — гэта структуры, сістэмы і іншае. Вы бачылі ў Беларусі. Калі вам нешта падыходзіць, вы скажыце, мы як добрыя блізкія людзі, сусядзі будзем прыязджаць і разам у Санкт-Пецярбургу ствараць тое, што вам падабаецца. І ў той жа час будзем вас прасіць, каб вы свой досвед і практыкі пераносілі на беларускую зямлю».

Аляксандр Лукашэнка заявіў аб жаданні пераарыентаваць на парты Санкт-Пецярбурга каля 20 млн тон грузаў. «Ёсць пра што пагаварыць, асабліва ў плане ціску Захаду на Беларусь. Мы цалкам хочам мільёнаў 20 тон пераарыентаваць, свае патокі, на вашыя парты. І буду прасіць у вас падтрымкі і дапамогі. З Прэзідэнтам Расіі мы аб гэтым дамовіліся. Вы ведаеце, ён вам тэлефанаваў наконт гэтага. Думаю, што калі мы з вамі тут разгорнемся, то і для Піцера гэта будзе добры кавалак працы. І для нашых піцерскіх сяброў добрыя працоўныя месцы», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Бягловў з цеплынёй згадаў свой нядаўні візіт у Мінск, сардэчны прыём на найвышэйшым узроўні. «Тое, што я ўбачыў, як развіваецца Беларусь, правільна, прыгожа, вельмі нам прыемна. Тое, што мы сёння сябруем, — вялікі знак павагі і даверу адно да аднаго. Так, у нас розныя краіны, але народ адзін», — сказаў губернатар.

На сустрэчы з кіраўніком Санкт-Пецярбурга Прэзідэнт Беларусі анансаваў «сур'ёзныя перагаворы па сур'ёзнай праблематыцы» з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным, якія адбудуцца сёння.

Паводле БелТА.

Парламенцкі дзённік

РАЗВІВАЦЦА — СТАБІЛЬНА І ЎСТОЙЛІВА

Пры гэтым павялічваць пенсіённы ўзрост у Беларусі не плануецца

Аб гэтым заявіў намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА, адказваючы на пытанні парла -ментарыяў падчас сумеснага пасяджэння Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. У Авальнай зале віцэ-прэм'ер выступіў з дакладам на тэму «Аб развіцці сацыяльнай сферы Рэспублікі Беларусь у сучасных умовах», у якім закрануў найбольш актуальныя моманты, якія хвалююць грамадства.

Падтрымка бюджэтнікаў і пенсіянераў

І першае, вядома, датычыцца павышэння заробку ў бюджэтнай сферы. Да гэтага пытання, па словах віцэ-прэм'ера, плануецца вярнуцца не пазней за верасень. «Пачынаючы з 1 сакавіка бягучага года, урад рэалізоўвае апярэджвальны графік павышэння базавай стаўкі аплаты працы бюджэтнікаў, — заўважыў ён. — Прынятыя меры дазволілі забяспечыць тут рост заработнай платы на 15 %. У дастаткова няпростых умовах функцыянавання эканомікі, якія складваюцца, абумоўленыя перш за ўсё знешнім ціскам, урад прымае сістэмныя меры па забеспячэнні стабільнага і ўстойлівага развіцця сацыяльнай сферы. Базавыя прынцыпы нашай работы застаюцца непарушнымі і арыентаванымі на канкрэтнага чалавека, яго патрэбы і інтарэсы».

Сёлета расходы кансалідаванага бюджэту на сацыяльную сферу запланаваны ў аб'ёме Br22,7 млрд, а разам са сродкамі фонду сацыяльнай абароны яны перавысяць Br42 млрд, або 25 % ВУП. Як падкрэсліў Ігар Петрышэнка, усе сацыяльныя выплаты, пенсіі, дапамогі, заработная плата ў бюджэтнай сферы выплачваюцца своечасова і ў поўным памеры.

З 1 кастрычніка ўводзіцца новая праграма пенсіённых назапашванняў з фінансавай падтрымкай дзяржавы — так званая праграма «3+3». «Разам з дзяржаўнай пенсіяй сёння вельмі важна актыўна развіваць і іншыя складнікі — карпаратыўныя пенсіённыя праграмы, сістэму індывідуальных пенсіённых зберажэнняў, — патлумачыў намеснік прэм'ер-міністра. — Рэалізацыя новай праграмы не павялічыць фінансавую нагрузку на работадаўцаў. Кожны, хто застрахаваны па гэтай праграме, атрымае суфінансаванне сваёй будучай назапашанай пенсіі ад дзяржавы, а эканоміка — дадатковы інвестыцыйны рэсурс, што надзвычай важна ва ўмовах, якія складваюцца».

Расказаўшы аб мерах падтрымкі пажылых грамадзян, Ігар Петрышэнка паведаміў, што паўтара мільёна беларусаў перасягнулі 65-гадовы рубеж. «У многім дзякуючы іх працалюбству, вялікаму патрыятызму, закладзены надзейны падмурак дабрабыту сучаснай Беларусі, — акцэнтаваў увагу віцэ-прэм'ер. — Па сёння людзі старэйшага пакалення працягваюць уносіць пасільны ўклад у развіццё грамадства, застаюцца актыўнымі грамадзянамі, гатовымі падзяліцца ўнікальнымі ведамі і вопытам, даць мудрую параду моладзі. Мы павінны зрабіць усё неабходнае для найбольш поўнай і эфектыўнай рэалізацыі патэнцыялу нашага старэйшага пакалення, павышэння якасці іх жыцця».

Другі год запар рэалізоўваецца зацверджаная ўрадам нацыянальная стратэгія актыўнага даўгалецця да 2030 года. Гэта першы праграмны дакумент, які вызначае асноўныя мэтавыя арыенціры і ключавыя задачы ў гэтай сферы.

Паляпшаць дэмаграфічную сітуацыю

Сёлета ўрадам будзе завершана падрыхтоўка законапраекта, які прадугледжвае комплексную карэкціроўку прававой базы ў галіне сацыяльнага абслугоўвання. У найбліжэйшы час дакумент будзе ўнесены ў Палату прадстаўнікоў. Законапраектам прадугледжваецца замацаваць новы механізм ацэнкі патрэбы насельніцтва ў сацыяльным абслугоўванні, таксама будуць перагледжаны падыходы да выплаты дапамогі па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту. Удасканаліцца і канцэпцыя дзейнасці дамоў-інтэрнатаў: плануецца больш шырока ўключыць у гэтую работу недзяржаўныя арганізацыі, якія аказваюць насельніцтву сацыяльныя паслугі.

Як заўважыў Ігар Петрышэнка, у цэлым за мінулы год колькасць тых, хто атрымлівае сацыяльныя паслугі, у краіне вырасла больш чым на 4 %. Сацыяльным абслугоўваннем ахоплена звыш 153 тысяч пажылых грамадзян і інвалідаў.

Што датычыцца дзіцячых дапамог, то сёлета дзеля гэтых мэт будзе накіравана звыш Br2,7 млрд. Падтрымка сем'яў з дзецьмі, як падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра, нязменна застаецца найважнейшым магістральным кірункам сацыяльнай палітыкі, якая рэалізоўваецца. «Наша агульная задача — развіваць умовы, каб беларусаў станавілася больш», — рэзюмаваў Ігар Петрышэнка.

Для гэтага ў краіне створана шматвектарная і ўсёабдымная сістэма: ад выплат дзіцячых дапамог, развіцця сеткі ўстаноў адукацыі, культуры, аховы здароўя да аказання фінансавай дапамогі пры будаўніцтве жылля. У прыватнасці, дзяржаўная праграма «Сямейны капітал», па якой штомесяц адкрываецца каля 1,2 тысячы новых рахункаў. Усяго ў бягучым годзе на іх прадугледжана каля Br380 млн.

Ігар Петрышэнка нагадаў, што з улікам патрэб шматдзетных сем'яў з пачатку гэтага года пашыраны магчымасці датэрміновага выкарыстання сродкаў, вылучаных па праграме «Сямейны капітал», па такіх кірунках, як жыллё, медыцына і адукацыя. Акрамя таго, дадзены від дапамогі цяпер можна накіраваць на набыццё таваraў для сацыяльнай рэабілітацыі і інтэграцыі ў грамадства дзяцей-інвалідаў.

Віцэ-прэм'ер звярнуў увагу і на тое, што колькасць шматдзетных сем'яў расце. Калі на 1 студзеня 2020 года іх было 104 тысячы, то сёння — ужо 119 тысяч. І калі гэта, безумоўна, станоўчая тэндэнцыя, то не можа не насцярожваць той факт, што павялічваецца ўзрост уступлення ў брак, а адпаведна, першы раз бацькамі маладыя людзі часцей за ўсё становяцца бліжэй да 30 гадоў.

— Гэта вельмі істотны фактар, які стрымлівае дэмаграфічны рост, — канстатаваў намеснік прэм'ер-міністра. — І наша сумесная задача — знайсці ключы да яго пераадолення. Неабходна сфарміраваць дадатковыя стымулы для больш ранняга нараджэння дзяцей, у першую чаргу — другіх.

Гульням быць!

Закрануў падчас свайго выступлення Ігар Петрышэнка і заявы еўрапейскіх чыноўнікаў аб выключэнні Беларусі і Расіі з Балонскага працэсу, а таксама тое, што шматлікія заходнія ўніверсітэты спынілі партнёрскае супрацоўніцтва з нашымі ВНУ ў адукацыйнай, навукова-даследчай сферы. «Не думаю, што з гэтага трэба рабіць праблему, — заўважыў ён. — Мы першапачаткова вельмі абачліва і ўзважана падыходзілі да ўдзелу нашай краіны ў гэтай арганізацыі і пакідалі прыярытэт за нацыянальнымі інтарэсамі».

Па словах віцэ-прэм'ера, інтэграцыя ў міжнародную адукацыйную прастору працягнецца. «Будзем вывучаць і пераймать лепшае, пераарыентуемся на паглыбленне сувязяў з сістэмамі адукацыі сяброўскіх нам краін», — адзначыў ён, звярнуўшы ўвагу на захаванне росту інтарэсу да беларускай адукацыі з боку замежных грамадзян.

Не абышоў у сваім выступленні Ігар Петрышэнка і ўвядзенне санкцый супраць беларускіх спартсменаў, увогуле абазначыў няпростую сітуацыю, якая сёння складваецца ў спартыўнай сферы. «Замежныя чыноўнікі шляхам увядзення санкцый проста пазбавіліся ад моцных сапернікаў у асобе беларускіх і расійскіх спартсменаў», — канстатаваў ён.

Па яго словах, Беларусь і Расійская Федэрацыя змогуць знайсці годную альтэрнатыву. Сумесна з Расіяй ужо створаны новыя спартыўныя спаборніцтвы ў фармаце ліг, кубкаў з асобнымі этапамі ў спартыўнай барацьбе, гандболе, біятлоне, лёгкай атлетыцы, у іншых відах спорту. Усяго ў бягучым годзе і зімнім сезоне 2022/2023 на тэрыторыі дзвюх краін прадугледжана правядзенне больш як 800 спартыўных мерапрыемстваў па 48 відах спорту.

Як расказаў намеснік прэм'ер-міністра, у наступным годзе з 3 да 15 жніўня ў Беларусі пройдуць II Гульні краін СНД. Чакаецца, што ў іх возьме ўдзел каля трох тысяч спарстменаў. Праграма Гульняў прадугледжвае правядзенне спаборніцтваў па 20 відах спорту ў дзевяці гарадах па ўсіх рэгіёнах краіны. «Перакананы, што Гульні стануць сапраўдным святам, якія мы ўмеем арганізоўваць», — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.

Увага медыкам і турыстычны патэнцыял

Не застанецца без дзяржаўнай дапамогі і сфера аховы здароўя. Урадам сумесна з аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прымаюцца ўсе неабходныя меры для стабільнага функцыянавання галіны і забеспячэння насельніцтва якаснай медыцынскай дапамогай.

— Фундаментальнай асновай, якая вызначае дабрабыт насельніцтва і адначасова выступае гарантам нацыянальнай бяспекі, з'яўляецца здароўе нашых грамадзян, — падкрэсліў Ігар Петрышэнка. — На працягу шэрагу апошніх гадоў расходы бюджэту на ахову здароўя складаюць больш чым 4 % ад ВУП. Пры гэтым у ковідны перыяд 2020—2021 гадоў фінансаванне галіны было значна павялічана.

Асноўная частка вылучаных дадатковых сродкаў (каля Br1,8 млрд) будзе накіравана на выплату надбавак медыцынскім работнікам за работу ва ўмовах інфекцый. Па рашэнні кіраўніка дзяржавы, увогуле ўсім медработнікам павысяць заработную плату.

Акрамя таго, падчас даклада была закранута і тэма турызму. Як заўважыў Ігар Петрышэнка, наш абавязак — захаваць культурны здабытак роднай зямлі для будучых пакаленняў, забяспечыць яго папулярызацыю, у тым ліку выкарыстоўваць у турыстычных мэтах. Віцэ-прэм'ер заўважыў, што павялічваецца цікавасць да беларускай гісторыі і культуры. «Турызм можа і павінен прыносіць прыбытак», — падкрэсліў ён.

Абараніць сябе

Пасля таго як Ігар Петрышэнка адказаў на пытанні парламентарыяў, дэпутаты прыступілі да абмеркавання чарговых законапраектаў. Падчас пасяджэння восьмай сесіі Палаты прадстаўнікоў адразу ў двух чытаннях быў разгледжаны законапраект «Аб змяненні Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь». Карэкціроўка дакумента накіраваная на ліквідацыю лішніх адміністрацыйных бар'ераў, выяўленых правапрымяняльнай практыкай, і стварэнне ўмоў для аператыўнага прыняцця рашэнняў мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі пры вызначэнні памеру аплаты за карыстанне арэндным жыллём.

У другім чытанні дэпутаты прагаласавалі за законапраект «Аб змяненні Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь». Як расказаў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Аляксандр ДУБАЎ,** палажэнні праекта накіраваныя на забеспячэнне законнасці, абгрунтаванасці і справядлівасці судовых пастанаўленняў па крымінальных справах, празрыстасці судовых працэдур, фарміраванне аднастайнай судовай практыкі, павышэнне аператыўнасці і эканамічнасці судовай дзейнасці.

У другім чытанні таксама прынялі законапраект аб аўтамабільным транспарце і аўтамабільных перавозках. Дакумент забяспечвае сістэмнасць і комплекснасць прававога рэгулявання грамадскіх адносін у галіне аўтамабільнага транспарту, а таксама будзе садзейнічаць павышэнню эфектыўнай дзейнасці суб'ектаў гаспадарання, якія ажыццяўляюць аўтамабільныя перавозкі пасажыраў і грузаў.

— Санкцыйная палітыка, якую праводзяць заходнія краіны, ідзе па ўсіх франтах, і мы гэта адчуваем, — заўважыла **член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Ірына ЛУКАНСКАЯ.** — Аднак правіла, па якім усё, што нас не забівае, робіць нас больш моцнымі, рэальна дзейнічае. Мы бачым, як нашы прадпрыемствы пераарыентавалі гандлёвую палітыку на краіны, якія хочуць з намі супрацоўнічаць. Мы захавалі аўтамабільную прамысловасць, робім выдатную медыцынскую тэхніку, развіваем узбраенне. Мы ўжо дакладна разумеем: каб мець суверэнную незалежную краіну, трэба ўмець абараняцца.

Удасканаленне прававога рэгулявання культурнай дзейнасці, асабліва тых кірункаў, якія звязаны з аховай гісторыка-культурнай спадчыны і культурна-масавымі мерапрыемствамі, абумовіла прыняцце законапраекта «Аб змяненні законаў па пытаннях культуры», разгледжанага ў другім чытанні. Акрамя таго, у другім чытанні дэпутаты прынялі законапраект аб Дзяржаўным камітэце судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь.

Паводле БелТА.

З нагоды

ПАМЯЦЬ АБ АХВЯРАХ І ПОДЗВІГУ ПРОДКАЎ — ДУХОЎНАЯ АСНОВА ЖЫЦЦЯ

Генеральны пракурор Беларусі Андрэй ШВЕД прыняў удзел у 32-м пасяджэнні Каардынацыйнага савета генеральных пракуратураў дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Свае краіны прадставілі кіраўнікі і дэлегацыі генеральных пракуратур Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана, Узбекістана, а таксама Сакратарыята КСГП СНД.

Падчас пасяджэння актыўна абмяркоўвалася работа над крымінальнай справай аб генацыдзе беларускага народа. Па словах Андрэя Шведа, расійскія калегі на падставе вялізнага масіву архіўных дакументаў папярэдне падрыхтавалі тыя звесткі, якія звязаны з генацыдам беларускага народа, з гэтымі дакументамі працуюць беларускія следчыя. «Адна з задач, якая будзе вырашацца, — пошук жывых злачынцаў. У расійскіх калег па гэтым пытанні таксама дастаткова канкрэтнай інфармацыі, і мы маем намер яе выкарыстоўваць, каб паўторна звярнуцца ў некаторыя дзяржавы, дзе яшчэ жывуць эсэсаўцы, і зноў паставіць пытанне аб іх адказнасці, паколькі генацыд не мае тэрміну даўнасці», — заявіў генпракурор.

Ён таксама падкрэсліў, што расійскія калегі зацікаўлены ў звестках, якія атрымлівае беларуская Генпракуратура. «У нас вялікі аб'ём інфармацыі дзякуючы таму, што мы штодзённа праводзім па ўсёй краіне спектр працэсуальных дзеянняў. Гэта і допыты жывых сведкаў, яны не спыняюцца, хоць на сёння дапытана ўжо больш за 15 тысяч чалавек. Выраблены сотні аглядаў месцаў масавага знішчэння. Праводзяцца канкрэтныя агляды месцаў здарэнняў з адабраннем астанкаў забітых людзей, рэчавых доказаў», — адзначыў Андрэй Швед.

Па словах генеральнага пракурора, падчас агляду шэрагу месцаў пахавання ўстанаўліваюцца звесткі аб канкрэтных грамадзянах былога Савецкага Саюза, у тым ліку чырвонаармейцаў. Гэта грамадзяне Расіі, Казахстана, Узбекістана.

«Памяць аб ахвярах і подзвігу нашых продкаў з'яўляецца духоўнай асновай жыцця грамадства, прыкладам для нас. У цяжкі перыяд Вялікай Айчыннай вайны мільёны жыхароў прынялі ўдзел у адстойванні дзяржаўнай незалежнасці. Гэта быў добраахвотны патрыятычны парыў, у якім заключаны дух свабоды народа, яго гатоўнасць самаддана адстойваць нацыянальныя і дзяржаўныя інтарэсы», — рэзюмаваў генеральны пракурор.

Трэба захаваць самае каштоўнае

Дарэчы, пасяджэнні Каардынацыйнага савета генеральных пракуратураў праходзілі адначасова са святкаваннем 100-гадовага юбілею са дня ўтварэння пракуратуры Беларусі. Свае віншаванні тым, хто стаіць на абароне законнасці, накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Векавы юбілей — гэта вяха, якая звязвае разам гісторыю лёсаў многіх пакаленняў. Тых, хто стаяў каля вытокаў стварэння беларускай дзяржаўнасці, і тых, хто беражэ найлепшыя традыцыі службы сёння. Вы забяспечваеце нацыянальную бяспеку, абарону суверэнітэту і канстытуцыйнага ладу нашай краіны. Сёння для нас як ніколі важныя вынікі расследавання фактаў генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Сабраныя доказы, устаноўленыя абставіны злачынстваў нацызму — гэта адэкватны адказ на кінуты нам выклік. Цяпер трэба захаваць самае каштоўнае, што ёсць у нашай краіне: мір, спакой, стабільнасць. Памножыць дасягненні беларускага народа, стварыць умовы для наступнага ўмацавання, развіцця і росквіту Беларусі. Абараняючы правы грамадзян, інтарэсы дзяржавы, пракуратура павінна быць у авангардзе рашэння гэтых задач», — гаворыцца ў відэавіншаванні, якое было паказана на ўрачыстым мерапрыемстве, прымеркаваным да свята.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў пракурорскім работнікам за вернасць прафесійнаму абавязку, адданасць Радзіме і беражлівае стаўленне да гістарычнай памяці народа. Ён пажадаў моцнага здароўя, дабрабыту, а таксама мірнага неба над галавой і новых здзяйсненняў на карысць Айчыны.

Валерыя СЦЯЦКО.

КРУЦЯЦЦА КОЛЫ ПАМЯЦІ...

Пілотны беларуска-расійскі патрыятычны праект «Цягнік Памяці» вандруе па гарадах Беларусі

Чарговым прыпынкам на маршруце стаў старажытны Віцебск. Праект, ініцыіраваны кіраўнікамі верхніх палат парламентаў Беларусі і Расіі Натальляй Качанавай і Валянцінай Матвіенкай, сімвалічна стартаваў у Год гістарычнай памяці ў Брэсце.
З 22 чэрвеня да 3 ліпеня беларускія і расійскія старшакласнікі праедуць шляхамі Вялікай Айчыннай вайны па гарадах дзвюх дзяржаў, наведаўшы значныя гістарычныя аб'екты.

Пасля горада-героя Брэста, які стаў для «Цягніка» адпраўной кропкай, дзвесце школьнікаў віталі ў Гродна. «Мы памятаем, што для нашых брацкіх народаў гэтыя дні — горкая дата — пачатак вайны, спроба знішчэння насельніцтва акупантамі. Таму галоўная мэта праекта, у якім вам пашчасціла прыняць удзел, — зберагчы і перадаць нашчадкам гістарычную праўду», — звярнуўся да **прысутных памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Юрый КАРАЕЎ**. Падчас другога дня ўдзельнікі праекта наведалі Новы і Стары замкі, Каложскую царкву, адзіную ў свеце імерсіўную інсталяцыю «Цягнік Перамогі», які таксама прыбыў у Гродна.

24 чэрвеня ў 9.18 школьнікі прыбылі ў паўночную сталіцу Беларусі. Удзельнікаў на пероне віцебскага вакзала сустракалі духавы аркестр і харэаграфічныя калектывы. Вітаючы гасцей, **намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў ДУРНОЎ** адзначыў, што цяжка пераацаніць уклад «Цягніка Памяці» ў патрыятычнае выхаванне і станаўленне актыўнай грамадзянскай пазіцыі моладзі, таму для ўдзельнікаў праекта гэтыя два тыдні — вялікая каштоўнасць.

Знаёмства з горадам падчас экскурсійнай праграмы «Па старонках гераічнай гісторыі тысячагадовага Віцебска» было насычана вялікай колькасцю аб'ектаў. Навучэнцам давялося зазірнуць за кулісы Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», наведаць «Алею зорак» каля летняга амфітэатра, загадаць жаданне каля скульптуры «Залатая рыбка» і памерацца ростам з самым высокім чалавекам у свеце Фёдарам Махновым, помнік якому ўсталяваны ў гістарычным цэнтры валошкавай сталіцы.

Старонкі Вялікай Айчыннай вайны арганізатары праекта прапанавалі пагартаць у музеі Памяці патрыётаў Віцебшчыны, размешчаным у сутарэннях былой турмы СД-9; у абласным музеі Героя Савецкага Саюза Міная Піліпавіча Шмырова; на плошчы Перамогі каля Мемарыяльнага комплексу ў гонар герояў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў. «Кожны наведаны горад пакінуў у маёй душы моцныя ўражанні: Брэст, Гродна, Віцебск. Вайна закранула кожную сям'ю: два мае прадзядулі загінулі пад Масквой і Сталінградам. Гэтыя ахвяры, прынесеныя на алтар агульнай Перамогі, нельга забываць», — падзялілася ўражаннямі школьніца з Самары Лізавета Юркова.

У межах рэалізацыі ініцыятывы «Віцебск — маладзёжная сталіца Рэспублікі Беларусь — 2022» хлопцаў і дзяўчат познаёмілі з навуковай і культурнай дзейнасцю вышэйшыя навучальныя ўстановы горада — ВДУ імя П. М. Машэрава, акадэмія ветэрынарнай медыцыны і медыцынскі ўніверсітэт. У форме квэстаў школьнікі знаёміліся са спецыяльнасцямі і абіралі для сябе магчымыя будучыя прафесіі.

Цікавым заканчэннем насычанага дня ў фестывальным Віцебску стала культурная праграма на сядзібе вядомага мастака Ілы Рэпіна ў Здраўнёве: тут моладзь наведала тэатралізаваную інтэрактыўную праграму «У пошуках папараць-кветкі» (па старым стылі менавіта 24 чэрвеня нашы продкі адзначалі Купалле), фітапляцоўку з дэгустацыяй гарбаты, маляўнічы пленэр, музычную гасцёўню.

А палове на дванаццатую ночы «Цягнік Памяці» адправіўся далей па гарадах нашай неабсяжнай краіны і брацкай Расіі. Напарадзе школьнікаў чакаюць Ржэў, Вязьма, Масква, Санкт-Пецярбург і іншыя гарады. Фінальным пунктам стане наведванне горада-героя Мінска ў дзень яго вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 3 ліпеня.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

Ведай нашых!

«ЗВЯЗДОЎЦЫ» — У ТОПЕ НАЙЛЕПШЫХ ЖУРНАЛІСТАЎ

Кітайскі камітэт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва па добрасуседстве, сяброўстве і супрацоўніцтве сумесна з парталам «Хуаньцюван» пры газеце «Жэньмінь жыбаа» правялі маштабны семінар «Новыя медыя: Кітай-ШАС 2022».

Сярод тэм падчас абмеркавання — роля СМІ Кітая і ШАС у міжнародных адносінах, уплыў метасусвету на медыясферу. Удзельнікі глабальнага вэбінара ўзнялі надзённую праблему кантэнтнага арыентавання на маладую аўдыторыю «пакалення Z», прааналізавалі ўзаемадзеянне лічбавай эканомікі і экалогіі сродкаў камунікацыі, а таксама правялі анлайн-рэпартажы з Маладзёжнага навукова-тэхнічнага і інавацыйнага форуму ШАС. Удзел у міжнародным мерапрыемстве ўзялі вядомыя кітайскія медыяэксперты, вучоныя, прадстаўнікі СМІ «шанхайскай сям'і», вядучыя медыяменеджары.

Па выніках глабальнага вэбінара экспертнае журы вызначыла топ найлепшых журналістаў. Сярод іх — намеснік галоўнага рэдактара газеты «Звязда» Мікалай Літвінаў, якому прысвоілі ганаровае званне «выдатнік».

Дарэчы, Мікалай Пятровіч сёння адзначае юбілей.

Віншуем калегу!

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Сусветная сетка аховы здароўя абвясціла воспу малпаў пандэміяй

Сусветная сетка аховы здароўя (WHN) прыняла такое рашэнне ў сувязі з тым, што «гэтая ўспышка не абмяжоўваецца адной краінай або рэгіёнам і павінна быць спынена шляхам прыняцця неадкладных мер усюды, дзе вірус перадаецца». У арганізацыі адзначылі, што цяпер выяўлены пацверджаныя выпадкі захворвання ў 58 краінах. Акрамя таго, спецыялісты падкрэслілі, што тэмпы распаўсюджвання павялічваюцца з кожным тыднем па ўсім свеце. Як заявіў генеральны дырэктар Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) Тэдрас Аданом Гебрэесус, у 48 краінах свету з пачатку гэтага года выяўлена больш за 3,2 тысячы пацверджаных выпадкаў заражэння воспай малпаў. Паводле яго слоў, маштабы перадачы віруса ад чалавека да чалавека, хутчэй за ўсё, недаацэнены. Гебрэесус нагадаў, што з пачатку гэтага года з Афрыкі прыйшлі паведамленні аб амаль 1,5 тысячы непацверджаных выпадкаў заражэння і аб прыкладна 70 смерцях. У асноўным размова ідзе аб Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга.

Украіне і Малдове далі статус кандыдатаў у члены ЕС

Лідары краін Еўрасаюза дамовіліся аб наданні статусу кандыдатаў у члены саюза Украіне і Малдове, заявіў старшыня Еўрапейскага савета Шарль Мішэль. «Еўрасавет вырашыў падараваць статус кандыдатаў у члены ЕС Украіне і Малдове», — напісаў ён у «Твітэры». Агенцтва Bloomberg адзначае, што ўлады ЕС дамовіліся аб неабходнасці выканання Грузіяй шэрагу ўмоў, перш чым атрымаць гэты статус. Працэс уступлення краін у Еўрасаюз уключае некалькі асноўных этапаў: падачу заяўкі, атрыманне статусу кандыдата, перагаворы, ратыфікацыя і інтэграцыя. За гады існавання ЕС уступленне краін займала розны час. Хутчэй за ўсё — менш чым за два гады — уступілі Аўстрыя, Фінляндыя і Швецыя. Рэкардсменам па тэрміне ўступлення пакуль з'яўляецца Харватыя — яе прынялі ў ЕС праз восем гадоў пасля пачатку перагавораў аб яе членстве ў саюзе. Цяпер у спісе краін-кандыдатаў знаходзяцца Албанія, Паўночная Македонія, Чарнагорыя, Сербія і Турцыя. Перагаворы аб уступленні Турцыі доўжацца з 2005 года, Чарнагорыі — з 2012-га.

Падчас узброенага сутыкнення з паліцыяй у Мексіцы загінулі 12 чалавек

Сама меней 12 чалавек загінулі падчас сутыкнення паміж паліцыяй і ўзброенымі людзьмі ў горадзе Эль-Сальта, што ў штаце Халіска на захадзе Мексікі. Аб гэтым паведаміў у «Твітэры» губернатар рэгіёна Энрыке Альфара, перадала агенцтва «Сіньхуа». Паводле яго слоў, паліцэйскія атрымалі інфармацыю аб канспіратыўным доме, дзе была схавана зброя. Прыбыўшы на месца, яны застрэлілі васьмярых злачынцаў, яшчэ трое атрымалі сур'ёзныя раненні. «На жаль, чацвёра паліцэйскіх з горада Эль-Сальта былі забітыя пры выкананні службовых абавязкаў», — дадаў губернатар. Як вядома, міністэрства абароны Мексікі ў сакавіку накіравала групу вайскоўцаў у штат Халіска для ўзмацнення назірання за злачыннай дзейнасцю.

Анонс

ВУЧОНЫЯ КРАІНЫ ПІШУЦЬ СЕННЕНСКУЮ ГІСТОРЫЮ

1-2 ліпеня на Віцебшчыне, у горадзе Сянно, пройдзе навукова-практычная канферэнцыя «Сенненскі край: гісторыка-культурная спадчына рэгіёна».

— Арганізатары сур'ёзнага даследчыцкага форуму — Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Сенненскі раённы выканаўчы камітэт. Мяркуецца, што ў рабоце канферэнцыі прымуць удзел больш чым сорак вучоных-гісторыкаў, археолагаў, архівістаў, супрацоўнікаў музеяў і краязнаўцаў: і з Мінска, і з Віцебска, і, зразумела, з самога Сянно.

— Праводзіць рэгіянальныя навукова-практычныя канферэнцыі стала добрай традыцыяй акадэмічных вучоных, — каментуе будучую падзею дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі кандыдат гістарычных навук Вадзім Лакіза. — Такія форумы спрыяюць стварэнню цэласнага гістарычнага партрэта рэгіёна, дазваляюць звярнуць увагу на ключавыя аспекты ў радзімазнаўчым партрэце краю. Як правіла, супольная праца з мясцовымі музейшчыкамі, краязнаўцамі дазваляе пашырыць уяўленне пра тую ці іншую прастору.

Сяргей ШЫЧКО.

ГОНАР КРАІНЫ

Першае афіцэрскае званне атрымалі 356 выпускнікоў Акадэміі МУС

Урачыстая цырымонія адбылася на плошчы Дзяржаўнага сцяга. З гэтай важнай падзеяй у жыцці маладых афіцэраў павіншаваў кіраўнік міліцэйскага ведамства.

— Вучоба ў вядучай міліцэйскай ВНУ была нялёгкай, але гэтыя гады будуць успамінацца як час атрымання важных прафесійных навыкаў і набыцця моцнага курсанцкага таварыства, — звяртаючыся да выпускнікоў, адзначыў **міністр унутраных спраў генерал-лейтэнант міліцыі Іван КУБРАКОЎ.** — На службе давядзецца прымаць розныя рашэнні. Але, разбіраючыся ў сітуацыях, памятайце: перад вамі — грамадзяне Беларусі, няхай і тыя, якія аступіліся, кіруйцеся законам і сумленнем.

Выказаўшы ўдзячнасць прафесарска-выкладчыцкаму саставу Акадэміі МУС, падзякаваў міністр і бацькам за выхаванне сваіх дзяцей. «Я ўпэўнены, што ніводны, хто стаіць у гэтым страі, не падвядзе, — падкрэсліў Іван Кубракоў. — Тут — сапраўдныя патрыёты, абаронцы сваёй Радзімы!»

Сярод наваспечаных лейтэнантаў — прэзідэнцкія стыпендыянты, уключаныя ў банк даных адоранай моладзі, а таксама выдатнікі вучобы, кандыдаты ў майстры спорту. З чырвоным дыпломам акадэмію скончылі 18 выпускнікоў, восем з іх атрымалі яшчэ і залатыя медалі.

Як заўважыў **намеснік дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі генерал-маёр юстыцыі Аляксандр РАХМАНАЎ,** афіцэрскі склад нашых сілавых ведамстваў папоўніўся новай зменай — таленавітымі, мэтанакіраванымі выпускнікамі, якія любяць сваю краіну.

Маладыя афіцэры працягнуць службу як у Міністэрстве ўнутраных спраў, так і ў Міністэрстве абароны, Следчым камітэце, Дзяржаўным камітэце судовых экспертыз, Дэпартаменце фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю і Дзяржаўным пагранічным камітэце.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Патрыёты

ДОБЛЕСНАЕ ЛЕТА,

або Як правесці школьныя канікулы з карысцю

Другі год запар пасля непрацяглага перапынку на базе вайсковай часці 3214 унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў функцыяне кругласутачны ваенна-патрыятычны лагер «Доблесць». На працягу дзевяці дзён школьнікі пераймаюць вопыт старэйшых настаўнікаў: займаюцца страявой, збіраюць і разбіраюць зброю, адпрацоўваюць сілавыя прыёмы, вучацца арыентавацца на мясцовасці... Зніжку на ўзрост, вядома, ім робяць. У астатнім — усё як у арміі. Дарэчы, самаму юнаму выхаванцу лагера — усяго сем гадоў.

Ахвотных шмат

На тэрыторыі воінскага злучэння сфарміравана першая змена ваенна-патрыятычнага лагера. Плануецца, што за перыяд летніх канікул «Доблесць» арганізуе адпачынак для шасці змен, куды ўвойдуць школьнікі з усіх раёнаў сталіцы. Праўда, адпачыць фізічна наўрад ці атрымаецца: штодзень выхаванцы вывучаюць прадметы баявой падрыхтоўкі падраздзялення, спецыяльнага прызначэння, практыкуюцца ў аказанні ваенна-медыцынскай дапамогі, асвойваюць навыкі стральбы са страйкбольнай, пнеўматычнай і агнястрэльнай зброі. Рэгулярна праходзяць заняткі і па асновах бяспекі жыццядзейнасці: падрастаючае пакаленне павінна разумець, як паводзіць сябе ў той ці іншай надзвычайнай сітуацыі. Акрамя таго, ёсць магчымасць пазнаёміцца з тэхнікай, якая стаіць на ўзбраенні вайсковай часці, паспрабаваць свае сілы ў рукапашным баі.

Узрост дзяцей, якія вырашылі такім чынам правесці частку летніх канікул, — з сямі да 14 гадоў. Трапіць у лагер можа кожны. Для гэтага напрыканцы года бацькам, якія жадаюць, каб іх дзеці яго наведвалі, трэба напісаць заяву ў школе, дашкольнай установе адукацыі. У выніку адбываецца размеркаванне. На дадзены момант усе шэсць змен, якія запланаваны, ужо расписаны. Праводзіцца на тэрыторыі часці яны будуць ажно да 30 жніўня ўключна.

— Ахвотных шмат, — адзначае **камандзір узвода ваенна-патрыятычнага лагера капітан Яўген ГАЛАЎКО.** — Для дзяцей адпачынак у падобнага роду лагерах патрэбны. З нашага боку важна зрабіць усё для таго, каб дзецям было цікава. Думаю, гэта атрымліваецца: многія з дзяцей пасля заканчэння змены не хочуць вяртацца дадому, просяць застацца тут, запісваюцца на другую, на трэцюю змены.

І гэта нягледзячы на тое, што хлопчыкі ў лагеры знаходзяцца кругласутачна. Дзяўчынкі начуюць дома. Раніцай бацькі іх прывозяць, а ўвечары забіраюць дадому.

Адчуць сябе абаронцам

Лета — выдатная пара. А лета, праведзенае з карысцю, застаецца ў памяці надоўга. Выхаванцам лагера няма калі сумаваць. Ваенна-патрыятычны лагер — гэта добрая магчымасць для школьнікаў адчуць на сабе жыццё і побыт абаронцаў Айчыны. Усяго за некалькі дзён хлопцы і дзяўчаты асвоілі страявы крок, збудавалі найпрасцейшыя схованкі, вывучылі спосабы аказання першай дапамогі пры раненні... Паспелі наведаць музей унутраных войскаў МУС Рэспублікі Беларусь і пазмагацца ў Клубе вясёлых і знаходлівых.

Кожны дзень у лагеры не падобны на папярэдні. Калі ў «Доблесці» знаходзіліся карэспандэнты «Звязды», для выхаванцаў была арганізавана ваенізаваная мініэстафета «Зарніца». Акрамя таго, дзеці патрэніраваліся ва ўстаноўцы турыстычных палатак, у развядзенні вогнішча без выкарыстання запальніц і запалак. Таксама школьнікі вучыліся арыентавацца на мясцовасці, шукалі схаваныя ад іх сакрэтныя прадметы. І ўжо не першы раз прыгатавалі ежу на вогнішчы, смачна паелі. Пасля сытнага абеду выхаванцы роўным строем пайшлі ў размяшчэнне, дзе кожнаму з іх вызначана месца для сну.

Два лепшыя сябры Кірыл Юцаў і Яраслаў Каза вельмі задаволены тым, як праходзіць іх лета. Бацькі хлопчыкаў таксама сябруюць. Кірыл ужо год наведвае ваенна-патрыятычны клуб «Рысь». Даведаўшыся, што на базе воінскага злучэння адкрываецца летні лагер, вельмі ўзрадаваўся. Правесці канікулы з карысцю прапанаваў і свайму сябру.

Яраслаў прызнаецца, што першапачаткова не вельмі хацеў ісці ў лагер, але ўжо з першых гадзін, праведзеных тут, ніколькі аб гэтым не пашкадаваў. «Мне ўсё тут падабаецца, — кажа школьнік. — Хачу навучыцца навыкам рукапашнага бою і асвоіць стральбу са зброі».

— Абавязкова буду дапамагаць свайму сябру, бо я ўжо шмат ведаю пра вайсковую службу, — далучаецца да размовы Кірыл. — Распавяду Яраславу пра ўсе званні, навучу, як правільна аддаваць воінскае прывітанне. Наогул, мы яшчэ з зімы чакалі гэтай змены. У лагеры «Доблесць» нас вучаць вайсковай справе. Мы ўжо ўмеем ставіць палаткі, страляць са страйкбольнай зброі, з паветраных вінтовак — халастымі патронамі, вядома. Акрамя гэтага, нас навучылі страявой падрыхтоўцы. Цяпер мы ведаем, як правільна засцілаць армейскі ложак, даведаліся, які парадак павінен быць у салдата. Мне тут вельмі падабаецца, хлопцы дружныя. За гэтыя дзевяць дзён я адчуў сябе сапраўдным абаронцам Айчыны.

Лагер як маленькае жыццё

Пяцікласніца Зарына Валуевіч у падобным лагеры ўпершыню. Дзяўчынцы тут вельмі падабаецца. «Асабліва запомніліся заняткі па стральбе, скалалажанні, — кажа школьніца. — Таксама нас водзяць на розныя экскурсіі. У лесе мы разводзім вогнішчы, ставім палаткі, рыхтуем ежу. Нас тут вучаць вольнай барацьбе і медыцыне. Калі нешта не атрымліваецца, хлопцы дапамагаюць — яны ў нас самыя дружныя і добрыя».

— У лагеры нас шмат чаму навучылі, — расказвае Яфім Іванец, які толькі пойдзе ў першы клас. — Асабліва ўразіла стральба з сапраўдных аўтаматаў. Мы хадзілі ў лес, наведвалі вяровачны гарадок, удзельнічалі ў конкурсах, гулялі ў «кракадзіла» і ў «самы спрытны», спявалі розныя песні, танцавалі, хадзілі ў музей. А яшчэ нас навучылі адціскацца на кулачках і пакаталі на сапраўдным бронемабілі! Мне ўсё падабаецца, тут крута! Я набыў шмат сяброў. Сюды прыйшлі і тыя сябры, з якімі я быў у мінулым лагеры. Я ўжо не першы раз тут. У гэты нават яшчэ больш цікава.

Лагер — гэта маленькае жыццё. Незабыўныя ўражанні і прыгоды, новыя сябры і цікавыя падзеі — вось тое, што хлопцы і дзяўчаты атрымалі тут усяго за некалькі дзён. За кароткі час школьнікі пазнаёміліся з армейскім жыццём, набылі карысныя ваенна-прафесійныя навыкі і, магчыма, захочуць у будучыні звязаць сваё жыццё са службай ва ўнутраных войсках. Ім тут, несумненна, будуць рады.

Усяго падчас летніх канікул ва ўнутраных войсках арганізавана 20 ваенна-патрыятычных лагераў, з іх — 14 кругласутачнага знаходжання. Больш як 700 хлопчыкаў і дзяўчынак, акрамя пачатковай ваеннай падрыхтоўкі, будуць займацца ідэалагічнай, фізічнай, медыцынскай падрыхтоўкай, наведаюць мноства экскурсій і канцэртаў.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Будзьце пільныя!

ЦЯГНІК У АДЗІН МОМАНТ НЕ СПЫНІЦЦА...

У перыяд сезона адпачынкаў і школьных канікул рызыка траўміравання грамадзян, у тым ліку чыгуначным транспартам, узрастае

Чыгунка заўсёды была аб'ектам павышанай небяспекі. Інтэнсіўны рух цягнікоў, у тым ліку цяжкіх грузавых саставаў, лініі электрараздачы, канцэнтрацыя вялікай колькасці людзей на буйных станцыях і вакзалах — усё гэта патрабуе ад чалавека асаблівай пільнасці і асцярожнасці. Аднак не кожны, хто знаходзіцца ў раёне чыгуначнага палатна або ў самім цягніку, ведае аб элементарных правілах паводзін на аб'екце павышанай небяспекі.

Аб гэтым сведчыць і трагедыя на прыпыначным пункце «Ратамка», якая ў канцы мая адбылася ў Мінскім раёне. Пад коламі цягніка загінула сям'я: маці і бацька, а таксама іх маленькае дзіця, якому быў усяго годзік! Па інфармацыі Следчага камітэта, 32-гадовы мужчына і яго 22-гадовая жонка, якія везлі сваё дзіця ў калясцы, перабягалі чыгуначныя пуці на папярэджвальны сігнал святлафора. Спяшаючыся на сваю электрычку, яны трапілі пад іншы цягнік. Усе загінулі. Жанчына, акрамя ўсяго, была цяжарная...

А колькі сітуацый, калі людзі не чуюць папярэджвальных сігналаў, бо праходзяць чыгуначныя пуці або пераязджаюць іх на веласіпедзе, будучы ў навушніках! Чаму бацькі, чые дзеці трапілі пад высакавольтнае напружанне, робячы сэлфі ў забароненых для гэтага месцах, не патлумачылі ім, што падобным гульням на чыгунцы не месца?! Няўжо людзі, нават будучы ў стане алкагольнага ап'янення, не разумеюць, што машыніст не здолее своечасова затармазіць, убачыўшы чалавека на чыгуначных пуцях?!

Не дапусціць гібелі і траўміравання

Па інфармацыі Міністэрства ўнутраных спраў, за пяць месяцаў гэтага года на аб'ектах чыгуначнага транспарту пацярпелі 32 чалавекі. Сем атрымалі траўмы, 25, у тым ліку двое непаўналетніх, загінулі. Толькі ў маі на чыгунцы адбыліся тры нясчасныя выпадкі з дзецьмі.

Трагедый магло быць і больш. Даюць вынік комплексныя меры па папярэджанні фактаў траўміравання дарожным рухомым саставам, якія прымаюцца супрацоўнікамі міліцыі ва ўзаемадзеянні з іншымі ведамствамі. У бягучым годзе супрацоўнікамі органаў унутраных спраў ужо выяўлена звыш 1600 такіх фактаў. Грамадзяне прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці. Адна з найбольш дзейсных мер па папярэджанні надзвычайных здарэнняў — пастаянная прысутнасць міліцыянераў на аб'ектах чыгуначнага транспарту.

— Наша задача заключаецца не ў тым, каб выявіць парушэнне і прыцягнуць чалавека да адказнасці, — заўважае **намеснік начальніка аддзела арганізацыі забеспячэння грамадскай бяспекі на аб'ектах транспарту падпалкоўнік міліцыі Віталь ЯКУБОЎСКІ.** — Галоўнае — не дапусціць таго, каб чалавек атрымаў траўму або загінуў. Мы спрабуем данесці да кожнага, што чыгунка — крыніца павышанай небяспекі. І правілы паводзін на ёй павінны адпавядаць патрабаванням, якія ўстаноўлены нарматыўнымі актамі, у цэлым жыццёвай сітуацыі.

Шматгадовы аналіз, праведзены па кожным факце гібелі і траўміравання людзей на чыгунцы, сведчыць: нярэдка грамадзяне не ўсведамляюць усёй небяспекі знаходжання на аб'ектах чыгуначнага транспарту. Асноўнай прычынай надзвычайных сітуацый з'яўляецца парушэнне імі правіл бяспекі.

Менавіта ігнараванне ўстаноўленых правілаў у мінулую суботу скончылася трагедыяй для жыхара Маладзечанскага раёна. На прыпыначным пункце «Вязынка» 41-гадовы мужчына спрабаваў перабегчы чыгуначныя шляхі на папярэджвальны сігнал святлафора менавіта ў той момант, калі набліжалася электрычка. Ад атрыманых траўмаў мужчына загінуў на месцы.

Катэгарычна забараняецца!

Каб даведацца пра найбольш распаўсюджаныя правапарушэнні на аб'ектах чыгуначнага транспарту, разам з намеснікам начальніка аддзела арганізацыі забеспячэння грамадскай бяспекі на аб'ектах транспарту Віталём Якубоўскім карэспандэнты «Звязды» накіраваліся на чыгуначны прыпыначны пункт «Інстытут культуры», які з'яўляецца адным з найбольш запатрабаваных у сталіцы. Адпаведна тут і вельмі інтэнсіўны рух цягнікоў. Усё абсталявана з улікам патрабаванняў бяспекі. За парадкам на станцыі сочаць супрацоўнікі ўнутраных спраў.

Віталь Якубоўскі расказвае, што, каб прадухіліць выхад на чыгуначнае палатно ў неўстаноўленым месцы, участкі чыгункі ў межах Мінска абсталёўваюцца агароджамі — такая тэндэнцыя апошніх гадоў. Таксама агароджваюцца тыя ўчасткі аб'ектаў чыгуначнага транспарту, дзе фіксуецца найбольш правапарушэнняў. Выхад на платформы прадугледжаны па наземных і падземных пераходах, што гарантуе пасажырам бяспеку. Калі ж нехта з мэтай скарачэння шляху вырашыць пералезці праз забор або перайсці чыгуначнае палатно там, дзе гэта забаронена, абавязкова трапіць у поле зроку міліцыянераў. У выніку нядобрасумленным грамадзянам прыйдзецца плаціць штраф.

— Пераход чыгуначных шляхоў у неўстаноўленым месцы з'яўляецца найбольш распаўсюджаным правапарушэннем на аб'ектах чыгуначнага транспарту, якое ў тым ліку ўплывае і на бяспеку руху, — заўважае намеснік начальніка аддзела арганізацыі забеспячэння грамадскай бяспекі на аб'ектах транспарту. — Перасякаць чыгуначнае палатно можна толькі па ўсталяваных і абсталяваных для гэтага месцах. На ўчастках інтэнсіўнага руху ўстаноўлены сістэмы апавяшчэння аб цягніку, які набліжаецца. Калі ёсць таблічкі з надпісамі «праход забаронены» або «службовы праход», пераходзіць чыгунку нельга. Катэгарычна забараняецца пераходзіць праз чыгуначныя шляхі перад цягніком, які набліжаецца або блізка стаіць.

І калі ў горадзе добрасумленнасць грамадзян пракантраляваць лягчэй, то ў месцах праходжання цягнікоў, якія знаходзяцца ўдалечыні ад населеных пунктаў, гэта амаль немагчыма. Мала хто задумваецца, што небяспечна нават ісці ўздоўж чыгуначных шляхоў. Калі цягнік імчыць на вялікай хуткасці, ёсць вераголнасць, што нешта можа адляцець (камень, друз, якім пасыпана чыгунка) і трапіць у чалавека. Акрамя таго, не варта знаходзіцца на краі платформы. Прычым гэта актуальна як для чыгуначнага транспарту, так і для метрапалітэна. Былі выпадкі, калі патокам паветра чалавека проста засмоктвала пад састаў. Падобная трагедыя здарылася і сёлета. Грамадзянін апынуўся ў міжкалейнай прасторы: з аднаго боку цягнік стаяў, з іншага — ішоў. Паветраны паток, які ўтварыўся, засмактаў чалавека пад састаў. Пацярпелы атрымаў траўмы, несумяшчальныя з жыццём.

Смяротныя сэлфі

Як адзначае Віталь Якубоўскі, большасць няшчасных здарэнняў, якія адбываюцца на аб'ектах чыгуначнага транспарту, звязана з траўміраванням рухомым саставам. Рэгіструюцца і выпадкі паражэння электрычным токам. Ахвярамі высокага напружання, як правіла, становяцца дзеці. Падлеткі любяць залезці на вагоны, сфатаграфавацца. Вядома, мала хто з іх задумваецца аб тым, чым можа скончыцца такая забава.

— Паражэнне электрычным токам адбываецца неабавязкова пасля таго, калі датыкаешся да электрычнай сеткі, — удакладняе прадстаўнік міліцэйскага ведамства. — Пры пэўных умовах надвор'я, іншых фактарах можа ўзнікнуць электрычная дуга, якая паражае чалавека. Такія выпадкі таксама рэгістраваліся. Так, у маі бягучага года на станцыі «Сцяпянка» ў Мінску пацярпеў непаўналетні 2009 года нараджэння, які ўзлез на вагон. На шчасце, ён застаўся жывы, але атрымаў тэрмічны апёк другой ступені. Электратраўма вельмі небяспечная: чалавек або гіне, або застаецца інвалідам на ўсё жыццё.

Яшчэ адна вельмі небяспечная тэндэнцыя — сэлфі або кароткае відэа на фоне цягніка, які набліжаецца. Не так даўно быў выпадак, калі дзеля ўдалага кадра дзяўчынка, якой не было і 14 гадоў, выйшла на чыгуначны шлях. У выніку дзіця загінула. Непрыемныя наступствы падчас знаходжання на аб'ектах чыгуначнага транспарту цягне за сабой і выкарыстанне навушнікаў, іншых персанальных сродкаў.

— Нават чалавек не можа ў адну секунду спыніцца пры пэўнай хуткасці, — заўважае Віталь Якубоўскі. — Тармазны шлях цягніка складае ў сярэднім каля кіламетра. Кожны выпадак экстраннага тармажэння можа прынесці шкоду як самой Беларускай чыгункі, так і пасажырам канкрэтнага саставу. Чалавек, напрыклад, можа ўпасці і пашкодзіць сабе нешта. Нясе за гэта адказнасць той, хто перасякае чыгуначнае палатно ў неўстаноўленым месцы або знаходзіцца на бяспечнай адлегласці ад цягніка.

І калі дзеці гінуць на чыгунцы з-за сваёй няўважлівасці, неасцярожнасці і непрадбачлівасці, то найбольш частай прычынай, па якой пад цягнік трапляюць дарослыя людзі, з'яўляецца іх знаходжанне ў стане алкагольнага ап'янення. Нецвярозаму чалавеку маюць права адмовіць і ў праездзе. Яго знаходжанне на аб'екце павышанай небяспекі, якім з'яўляецца чыгунка, увогуле рызыкоўнае: п'яны чалавек можа не толькі загінуць або атрымаць траўмы, упаўшы пад цягнік, але і сам здзейсніць злачынства або стаць ахвярай зламыснікаў.

Прафесія дапамагаць

Накіроўваемся на чыгуначную станцыю «Мінск-Пасажырскі». Гэта ключавая чыгуначная артэрыя краіны, праз якую ў суткі праходзяць сотні цягнікоў, сотні тысяч чалавек. Дзеля бяспечнага іх знаходжання на аб'екце чыгункі супрацоўнікі міліцыі нясуць тут дзяжурства ва ўзмоцненым кругласутачным рэжыме.

Прыбываем цягнік рэгіянальных ліній эканом-класа. Супрацоўнікі міліцыі кантралююць пасадку пасажыраў, у пэўных выпадках суправаджаюць электрычкі на ўчастках следавання: як правіла, у перадвыхадныя, выхадныя дні, падчас дачнага сезона, перыяду водпускаў, калі людзі ездуць да месцаў масавага адпачынку. Нягледзячы на тое, што ў вагонах рэгулярна гучаць аб'явы аб выкананні мер бяспекі, паведамляецца, каб пасажыры сачылі за сваімі рэчамі, у цягніку можа здарыцца ўсякае. Адзін нецвярозы чалавек можа зрабіць усё, што заўгодна. Грамадзяне часта баяцца зрабіць яму заўвагу, і вельмі добра, што могуць звярнуцца да нарада, які праходзіць на цягніку. Не сакрэт, што супрацоўнікі міліцыі яшчэ і дысцыплінуюць пасажыраў.

— Вакзал — вароты горада: калі людзі прыязджаюць, першае, што яны бачаць, — вакзальны комплекс, — гаворыць Віталь Якубоўскі. — Заўсёды пасажыры ўбачаць і супрацоўніка органаў унутраных спраў. Калі ў іх на шляху следавання адбыліся пэўныя непрыемнасці, то адразу па прыбыцці яны могуць звярнуцца да міліцыянера, які ўважліва іх выслухае і дапаможа.

У адрозненне ад гарадской патрульна-паставой службы, якая ў асноўным несе службу ў крымінагенных месцах або на аб'ектах, якія патрабуюць павышанай увагі, на вакзале супрацоўнікі міліцыі часцей за ўсё працуюць на прафілактыку. Нават сваёй адной прысутнасцю міліцыянер можа спыніць чалавека, які задумаў здзейсніць правапарушэнне.

— Вакзал — гэта магніт, што прыцягвае злачынныя элементы і людзей, якія выношваюць злачынную задуму, — акцэнтуе ўвагу **камандзір роты патрульна-паставой службы міліцыі мінскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце падпалкоўнік міліцыі Сяргей ХУДОБА.** — Асабліва прывабны для парушальнікаў закона начны час, калі пасажыры стомленыя, хочуць адпачыць, чым зламыснікі і карыстаюцца. Міліцыянеры ведаюць гэта і рэгулярна ходзяць па радах, будзяць пасажыраў, каб яны не праспалі ні свой цягнік, ні сваю маёмасць.

А яшчэ, акрамя непасрэдных абавязкаў, міліцыянеры аказваюць людзям пасільную дапамогу: суправаджаюць інвалідаў, дапамагаюць выйсці з цягніка пажылым пасажырам, дзякуючы гучнай сувязі шукаюць тых, хто згубіўся. Калі камусьці з пасажыраў стала дрэнна, аказваюць і першасную медыцынскую дапамогу.

Як заўважае Сяргей Худоба, да міліцыянераў патрульна-паставой службы, якія нясуць дзяжурства на вакзале «Мінск-Пасажырскі», прад'яўляюцца асаблівыя патрабаванні. «Міліцыянеры павінны быць падкаваныя юрыдычна, павінны ўмець адказаць на любое пытанне пасажыраў, прычым на англійскай мове таксама, — удакладняе ён. — Часам да супрацоўнікаў унутраных спраў звяртаюцца як у даведачнае бюро: да іх паступаюць як самыя элементарныя пытанні накшталт «Як прайсці на цягнік?», так і пытанні, звязаныя з размяшчэннем аб'ектаў на тэрыторыі горада Мінска».

Кругласутачнае нясенне службы дзяжурнымі нарадамі міліцыі ажыццяўляецца на буйных чыгуначных вузлах у кожным рэгіёне краіны. У невялікіх населеных пунктах кантроль за выкананнем правіл бяспекі ў раёне чыгуначных шляхоў нясуць участковыя інспектары. Аднак, спадзеючыся на кампетэнтныя органы, людзі, якія карыстаюцца паслугамі чыгуначнага транспарту, у першую чаргу падчас знаходжання на такіх аб'ектах павінны выконваць правілы бяспекі і разумець, што цягнік раптоўна не спыніць ніхто, нават міліцыянер.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

РАЗВІТАННЕ З ПАСТЫРАМ

Памёр протаіерэй Сергій Гардун



Пра ўсіх, каго добра ведаў, гаварыць у мінулым часе нязвыкла і цяжка. А ў гэтым выпадку яшчэ цяжэй з-за таго, што сваю ўладнасць драматычны час нагадвае так неспадзявана. У вечнасць адышоў протаіерэй Сергій Гардун — клірык Свята-Духавага кафедральнага сабора, свяшчэннік-прафесар, выкладчык Мінскай духоўнай семінарыі з моманту яе аднаўлення і Мінскай духоўнай акадэміі ад заснавання, першы прарэктар Інстытута тэалогіі БДУ.

Ад самага пачатку а. Сергій уваходзіў у склад Беларускай біблійнай камісіі, узначаліўшы рабочую групу па перакладзе на сучасную беларускую мову Свяшчэннага Пісання. Склаў і сам пераклаў Беларускі малітваслоў, актыўна ўключаўся ў выдавецкія справы, у прыватнасці Выдавецкага савета Беларускай праваслаўнай царквы. Нельга не адзначыць таксама, што многія гады ўсёй нашай краіне ён даваў каментарыі на беларускай мове да ўрачыстых богаслужэнняў на Раство і Уваскрэсенне Хрыстова.

Каракей кажучы, гэта якраз такая асоба, адсутнасць якой будзе доўга і балюча ўспрымацца, бо неаднойчы паўстане праблема: а кім жа яе замяніць?!

Мяне з высокашаноўным протаіерэем Сергіем тры дзесяцігоддзі звязвалі як многія агульныя справы, так і шчырыя сяброўскія адносіны. У свой час ад імя актыву біблійнай камісіі віншаваў яго з юбілеем пастырскага служэння. Тады напісаліся вось якія словы:

«Ваша высокапрападобіе, дарагі айцец Сергій!

Усе, хто знаёмы з Вамі, сведчаць, што Гасподзь шчодра адарыў Вас, а Вы належным чынам скарысталі дараваныя Ім таленты, набыўшы заслужаны аўтарытэт клапатлівага пастыра, глыбокага багаслова, нястомнага місіянера, красамоўнага прапаведніка, адказнага педагога, прынцыповага публіцыста, грунтоўнага філолага-перакладчыка... Так што для ўсіх, хто Вас ведае, Вы з'яўляецеся пацвярджэннем слоў Апостала: «Усё магу ў Ісусе Хрысце, Які мяне ўмацоўвае». І мы, хто на працягу ўжо даволі значнага часу мае гонар і задавальненне быць побач з Вамі, гэта адказна сведчым. Прыміце ад нас самыя сардэчныя віншаванні ў сувязі з дваццацігоддзем пастырства і духоўна-асветнай дзейнасці, а таксама пажаданні шмат-шмат гадоў яшчэ служыць у славу Богу і на карысць Айчыны.

А больш і лепш няхай скажуць пра Вас тыя, хто будзе віншаваць з многімі наступнымі юбілеямі».

Пасля гэтага, слава Богу, былі яшчэ юбілеі. Аднак больш іх, на жаль, не будзе, паколькі дарагі і незабыўны айцец Сергій адышоў да Госпада.

Падай яму, Гасподзі, Царства і далучэнне да вечных Тваіх даброт і Твайго бясконцага блажэннага жыцця асалоду!

Іван ЧАРОТА.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191021390
Продавец	ОАО «Белдортранс», Минский р-н, п/о Озерцо, 28 км МКАД. УНП 690020891
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. УНП 191224638
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронного аукциона
Адрес: **Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, 95-5, район аг. Озерцо**

Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер
Изолированное помещение № 5	Производственное помещение	**194,9 кв. м**	600/D-123140

Начальная цена лота с НДС 20 % – 179 891,71 бел. руб.
(снижена на 20 %)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (г. Минск), БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов: если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единствен. участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по нач. цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **20 (двадцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах: торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, которое размещается на странице лота во вкладке «Документы». Страница лота содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов и продавцу затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 28.05.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов в 11.00 – 07.07.2022.** **Окончание торгов в 12.00 – 07.07.2022.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 06.07.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Продавец: открытое акционерное общество «Витебский приборостроительный завод», 210026, г. Витебск, ул. Гагарина, 4, тел. 8 (0212) 36-27-07.

Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 200/С-51709 площадью 1500,00 кв. м, наименование – котельная, назначение – здание неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4/5, составные части и принадлежности: пристройка, расположенное на земельном участке с кадастровым № 240100000001000497 площадью 3,9964 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4 (общая долевая аренда). Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с законодательством.

Нач. цена: 38 100,00 бел. руб. без учета НДС.

Задаток: 3 810,00 бел. руб.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 22.07.2022 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 27.06.2022 с 08.30 по 21.07.2022 до 17.30. Ранее опубликованные извещения: газета «Республика» 26.11.2021 г. № 227, газета «Республика 15.02.2022 г. № 29, газета «Звязда» 30.04.2022 г. № 11.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Условия повторного аукциона: победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения аукциона на р/с, указанный в протоколе аукциона (расходы Доверителя на проведение независимой оценки – 322,70 бел. руб. с НДС 20 %, на проведение экспертизы независимой внутренней оценки – 440,23 бел. руб. с НДС 20 %), на р/с, указанный в протоколе аукциона; заключить договор купли-продажи в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона, оплатить предмет аукциона в течение 10 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета аукциона. **Повторный аукцион проводится в порядке, установленном Указом Президента Республики Беларусь № 232 от 05.05.2009 г. «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» и Положением «О порядке организации и проведении торгов по реализации имущества ОАО «ВПЗ» от 28.04.2022 г.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивид. предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивид. предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Позняк Светлана Георгиевна, +375 (33) 317 50 00.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5
Продавец	Белорусский республиканский союз потребительских обществ, г. Минск, пр-т Победителей, 17, комн. 409
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронного аукциона.
Адрес: г. Минск, ул. Бабушкина, 64/1

4593/9163 доли в праве на цех по производству контейнеров (назначение: здание неустановленного назначения, общ. пл. 4593 кв. м, инв. № 500/С-31904).

В состав лота входит следующее иное имущество: оградительная перегородка 18200*2800 мм (инв. № 9000003), лебедка с каркасом 1500*1500 мм TOR KCD 1000 T21 (инв. № 9000004), вентиляционная установка В-2 (инв. № 9000002), ворота откатные 3400*3000 (инв. № 9000005), металлический забор 2000*1000 (инв. № 9000006), тепловентиляторы вод. КЭВ-106Т4W2 с водяным калорифером (инв. № 9000007, 9000008, 9000009), тепловентиляторы вод. КЭВ-40Т3,5W3 в комплекте с ПУ (инв. № 90000011, 90000012), вентиляционная установка В-1 (инв. № 80000035), кран-балка (инв. № 90000013), тельфер 3,2 т (инв. № 90000014), электротельфер г/п 2 т «Колядичи» с кран-балкой (инв. № 90000015), жалюзи – роллеты 3085*3205 (инв. № 90000019), навес для участка производства стеклопакетов (инв. № 9000001), навес – склад для мебельного участка (инв. № 90000020), навес – склад для механического участка (инв. № 90000021), перегородка 11080*3500 мм (инв. № 90000033)

Начальная цена лота с НДС 20 % – 1 803 862,56 бел. руб.

Обременения: площади здания сданы в аренду

Задаток 3 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **1 (один) %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 13.05.2022 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов – 08.07.2022 в 14.00.** **Окончание торгов – 08.07.2022 в 15.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 07.07.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

Изменения в проектную декларацию

«Группа многоквартирных жилых домов в районе пересечения улиц Стрелковой и Рыбалко в г. Минске». Жилой дом № 2.1 по генплану. 2-я очередь строительства, опубликованную в газете «Звязда» 31.03.2022 г.

Информация о застройщике: ОАО «БЕЛАТЭП» (ОАО «БЕЛАТЭП»); местонахождение: 220033, г. Минск, ул. Рыбалко, д. 5, пом. 127. Режим работы: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обеденный перерыв с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье;

количество предлагаемых для заключения договоров объектов долевого строительства: 50 единиц;

цены на объекты долевого строительства:

1-комнатные квартиры общей площадью от 44,89 м² до 45,14 м². Стоимость строительства 1 м² квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную от 1200 до 1250 долларов США.

2-комнатные квартиры общей площадью от 44,23 м² до 64,17 м². Стоимость строительства 1 м² квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную от 1150 до 1300 долларов США.

3-комнатные квартиры общей площадью от 60,06 м² до 77,60 м². Стоимость строительства 1 м² квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную от 1080 до 1230 долларов США.

У застройщика действует система регулирования стоимости в зависимости от площади, этажа, условий оплаты строящегося жилого помещения, и иных факторов, влияющих на стоимость;

условия оплаты: оплата цены объекта долевого строительства (цены договора) производится дольщиком единовременно не позднее 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в МГИК. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному НБ РБ на дату оплаты. Датой оплаты признается дата фактического зачисления денежных средств на счет Застройщика.

При рассрочке (50 % в течение 5 календарных дней после регистрации договора, остаток – по графику платежей) стоимость 1 м² увеличивается на сумму белорусских рублей, эквивалентную 30 долларам США.

При привлечении кредита по партнерским программам банков стоимость 1 м² увеличивается на сумму белорусских рублей, эквивалентную 50 долларам США.

ИЗМЕНЕНИЕ в проектную декларацию № 2

на строительство объекта: «Строительство жилого микрорайона в г. Смолевичи (микрорайон Липки)». II очередь строительства. Индивидуальные жилые дома, КПП, ограждение территории. I пусковой комплекс.»,

опубликованную в газете «Звязда» от 17 ноября 2021 г. № 222 (29591).

Абзац восемнадцатый части второй раздела «Информация о проекте» изложить в следующей редакции:

«По настоящей проектной декларации для категории граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, а также для индивидуальных предпринимателей, юридических лиц предлагаются для заключения договоров создания объектов долевого строительства следующие объекты долевого строительства:

Индивидуальный жилой дом	Стоимость 1м², бел. руб.
№ 56 (тип 3-1)	2 016,00

УНП 100011299

Извещение о проведении электронных торгов

Организатор/продавец электронных торгов: РУП «Белоруснефть-Минскавтозаправка»

Оператор электронной торговой площадки: Республиканское унитарное предприятие «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь». Адрес: www.torgi.gov.by

Предмет электронных торгов (местонахождение: г. Минск, пр-т Дзержинского, 73а)

Лот №	Наименование	Начальная цена с НДС, бел. руб.
1	Топливораздаточная колонка V-LINE H4604 080/2/40 WITH VR 2/6	3 544,86
2	Топливораздаточная колонка V-LINE H4604 080/2/40 WITH VR 2/6	3 544,86

Дата проведения электронных торгов: 25.07.2022 С дополнительной информацией о продаваемом предмете электронных торгов можно ознакомиться на сайте torgi.gov.by. Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу 22.06.2022

Контактные данные: +375 17-279-88-43, e-mail: E.Drozd@beloil.by

УНП 190583381

ЦІ ЗАМЕНІЦЬ РОБАТ МЕХАНІЗАТАРА

Майстар-клас ад Панасюгі

То-бок прыклад таго, як з адстаючага прадпрыемства робіцца перадавое. Асаблівая нагода для гонару ў Пятра Іванавіча — сем дыпломаў, за кожны год яго работы ў якасці кіраўніка «Горацкага элеватара». Гэта красамоўная адзнака работы дырэктара. «З 2014 года тры разы завaёўвалі ў раённым спаборніцтве пераходны Чырвоны Сцяг, два разы дыплом другой ступені і адзін — трэцяй», — ганарыцца Пётр Панасюга. Успамінае, што ў 2014 годзе, калі ён толькі прыйшоў сюды працаваць, тут была поўная безгаспадарчасць. З педантычнасцю навукоўца ён усё зафатаграфаваў, зафіксаваў і паклаў пачатак новай эры «Горацкага элеватара». Дзякуючы гэтым фота можна рэальна ўявіць, які шлях прайшло прадпрыемства за восем гадоў. Сёння тут не толькі прымаюць і апрацоўваюць збожжа, але і ствараюць экструдаваныя кармы для жывёл. Апроч гэтага, распрацаваны бізнес-план для вырабу пелет з «мякіны».

Усё тут па-гаспадарску. Двор заасфальтаваны, сонечныя батарэі, кацельная на мясцовых відах паліва. Першае, што зрабіў новы кіраўнік, — адмовіўся ад прыроднага газу. Цяпло дае смецце, што застаецца ад збожжа — мякіна, пыл (з гэтага, дарэчы, і плануецца рабіць пелеты). Шмат увагі ўдзяляецца стварэнню ўмоў для калектыву. Ёсць спартыўная зала, душавыя, вялікі пакой для адпачынку і прыёму ежы, знайшлося месца цяпліцам, дзе спеюць агуркі і памідоры.

— У нас і страхоўка пенсіі ёсць, і медыцынскае страхаванне, і даплаты за здаровы лад жыцця, і матэрыяльная дапамога да ўсіх свят, — пералічвае суразмоўца. — За год адной дапамогі набягае паўтары тысячы.

Плюс 13-я зарплата. За кошт прыбытку аплачваецца харчаванне (смачнае, дарэчы, была нагода паспрабаваць. — **Аўт.**). Тыя, хто болей чым 20 гадоў адпрацаваў, пры выхадзе на пенсію да 10 сярэднямесячных заробкаў атрымлівае, амаль гадавую пенсію за адзін раз.

Падчас экскурсіі кіраўнік звяртае ўвагу на рухавікі, што задзейнічаны на транспарціроўцы збожжа.

— Раней тут стаялі малаэфектыўныя, за гадзіну падымалі ўсяго 120 тон зерня, — тлумачыць ён. — За кошт удасканалення рэдуктараў мы істотна знізілі спажыванне электраэнергіі і павысілі эфектыўнасць пастаўкі збожжа ў 1,5 раза. Гэта дало рост вытворчасці працы. Калі палічыць выпрацоўку на аднаго работніка, нам сёння няма роўных у Горацкім раёне. Рост адбыўся і за кошт укладання ўласных інвестыцый.

Накіроўваемся ў дыспетчарскую. На шчыце ва ўсю сцяну мігаюць лямпачкі, відаць, што працэс рухаецца. Але дырэктар прывёў мяне сюды не каб пахваліцца.

— Гэта ўжо ўчарашні дзень, — кажа ён. — Тут трэба паставіць вадкакрышталічны дысплей, а ўсё гэта грувасткае абсталяванне — сабраць у адну маленькую каробачку. Тады будзе па-перадавому. Але для гэтага трэба прыпыніць работу ўсяго прадпрыемства, а таму пакуль нерэальна. Хоць сістэму зрабілі больш дасканалай, паставілі тэрмападвескі, праз кожныя пяць метраў замяраецца тэмпература збожжа.

На прынцыпова новым абсталяванні было б меней задзейнічана людзей на абслугоўванні, болей было б аўтаматызацыі і кантролю. Але грошы на мадэрнізацыю, што былі, прыйшлося ўкласці ў дзве стратныя дрыбінскія гаспадаркі, якія ў 2019 годзе перадалі «Горацкаму элеватару» на правах давернага кіравання. А гэта, як ні круці, баласт. Бо інвестар павінен разлічвацца з чужымі даўгамі ды яшчэ ўкладвацца ў адсталую вытворчасць. Яна ж не адразу пачынае даход прыносіць.

— За два гады мы, вядома, не дасягнулі там вялікіх вышынь, але рывок зрабілі, — кажа Пётр Панасюга. — Тэхналогіі, якія прымяняюцца ў гэтых дзвюх гаспадарках, дазволілі падняць узровень надояў з ранейшых 1,6 тоны і 800 кілаграмаў малака на карову да 7,5 тоны малака на кожнай. І гэта яшчэ не мяжа.

А што там з кадрамі?

Як зразумець: прыбытковая галіна сельская гаспадарка ці не? Калі лічыць па папулярнасці сельскіх прафесій сярод моладзі і стане некаторых гаспадарак, то не. Але калі ўспомніць той жа калгас «Радзіма» ў Бялыніцкім раёне, якім кіраваў Аляксандр Лапацентаў, або «Зару» ў Магілёўскім, на чале якой стаіць Кацярына Зароўская, то адназначна прыбытковая. Што перашкаджае астатнім дацягвацца да ўзроўню паспяховых? Пётр Панасюга лічыць, што тут усё залежыць ад кіраўніцтва. Кадры трэба выхоўваць з дзяцінства. Асабіста сябе ён лічыць аграрнікам да канчыкаў пазногцяў. Яго бацькі працавалі ў калгасе, па іх слядах пайшлі пяцёра дзяцей з шасці. Перад вачыма быў бацькоўскі прыклад, ды яшчэ з розных сельскагаспадарчых ВНУ прадстаўнікі ў школу прыязджалі агітаваць. Была магчымасць паступіць па спецнаборы ў Маскву ў Мічурынскі інстытут. Суразмоўца родам з Браншчыны, але абраў для сябе Беларускую сельгасакадэмію. ВНУ і ў Саюзе была адной з вядучых.

Успамінае, што ў той час прэстыж сельскіх прафесій быў вялікі. З першага разу будучы аграрый нават пры вялікім жаданні і сярэднім бале атэстата 4,75 пры 5-бальнай сістэме не змог стаць студэнтам. Два ўступныя экзамены здаў на пяцёркі, яшчэ два — на чацвёрку і тройку. Адным словам, не прайшоў па конкурсе. І толькі ўжо пасля арміі і васьмімесячных падрыхтоўчых курсаў паступіў. Саўгас Унечыцкага раёна, які даў накіраванне на вучобу, ужо з першага месяца вучобы заахвочваў будучага спецыяліста рублём. І гэта таксама важна.

— Аляксандр Лапацентаў нездарма стыпендыі школьнікам назначаў, — прыводзіць прыклад суразмоўца. — Кадры трэба шукаць пачынаючы з пятых класаў. Летам школьнік на таку папрацаваў, а восенню кіраўнік гаспадаркі на школьную лінейку прыйшоў і хлопцу падзякаваў, а то і прэмію ўручыў. Вось гэта клопат. Мы з Беларускай сельгасакадэміяй сувязь трымаем. Сёлета ў нас на пасяўной адзін студэнцкі атрад працаваў, летась два на ўборачнай, адзін з якіх па сваіх паказчыках заняў 1-е месца ў вобласці і па краіне быў адзначаны ў ліку найлепшых. І сярэдняя зарплата была ў іх каля трох тысяч рублёў. Той, хто з сяла, з дзяцінства з бацькам у кабіне ездзіў, здалёк бачны.

— А сённяшнія агракласы чаму не выйсце?

— Гэта таксама трэба развіваць. Мой сын 1980 года нараджэння, выпускнік першага агракласа горацкай школы № 4. У акадэмію паступаў па выпускных экзаменах школы на агранамічны факультэт і сёння працуе ў мяне галоўным тэхнолагам. Зараз колькасць агракласаў пашыралася, у Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію паступаюць таксама выпускнікі каледжаў агратэхнічнага профілю, існуе мэтавая падрыхтоўка, але гэтага недастаткова. Яшчэ раз паўтаруся, трэба працаваць з кадрамі, размаўляць з імі, заахвочваць. Той жа Мікалай Шарснёў, былы губернатар Віцебскай вобласці, маладым спецыялістам сельскагаспадарчай галіны даплачваў з бюджэту. Вельмі правільны падыход. І выхадныя ў іх павінны быць, каб з'ездзіць у горад, з дзяўчынай сустрэцца. Буйныя агрохолдынгі, сапраўды, — выйсце. Той жа агракамбінат «Сноў», дзе 2,5 тысячы работнікаў, або «Зара», дзе іх болей за 1000. Без выхадных маладыя не будуць працаваць. Яны пойдуць туды, дзе ім зручней.

Каб вырасціць доброга спецыяліста, трэба, каб ён, як у савецкі час, прайшоў усе стадыі, пачынаючы ад загадчыка фермы да намесніка дырэктара, і толькі тады стаў кіраўніком. А сёння як? Дыплом атрымаў — і наперад. Пяць ВНУ краіны рыхтуюць кадры для сяла, але іх не хапае. Тыя ж заатэхнікі, аграномы, інжынеры растаюць ў іншых галінах народнай гаспадаркі. Ведаеце, колькі паступае ў аграрныя ВНУ сельскай моладзі? Усяго 15—20 %. Астатнія з горада. А потым ідуць у праграмісты, іншыя спецыяльнасці. Добра, калі два гады адпрацуюць. Раней у школе на сяле было 200—400 школьнікаў, цяпер — 70—80.

Работа па спадарожніку

Сёння робіцца акцэнт на выкарыстанне ў сельскай гаспадарцы высокіх тэхналогій. Найбольш прасунутыя гаспадаркі займаюцца земляробствам па спадарожніку, нехта прымяняе квадракоптары. Ці можна спадзявацца, што ў хуткім часе сельскагаспадарчая галіна стане ў нас рабатызаванай?

— У Беларусі ўжо ёсць гаспадаркі, дзе робаты дояць кароў, тая ж малочнатаварная ферма «Белшыны-агра» — філіял бабруйскай «Белшыны», — прыводзіць прыклад Пётр Іванавіч. — Вельмі высокатэхналагічная кампанія «Беларуская нацыянальная біякарпарацыя» ў Пухавічах. У Кітаі такіх 5-6 вытворчасцяў.

— А механізатараў робатамі можна замяніць? Памятаеце, як у савецкай кінастужцы «Справа была ў Пянькове», дзе трактар без кіроўцы па полі ездзіў? Добрае вырашэнне праблемы дэфіцыту кадраў.

— Гэта так званае кропкавае земляробства. Там прысутнасць чалавека мінімальная. Тэхніка кіруецца з дапамогай спадарожніка. Калі 15 гадоў таму да нас прыязджалі спецыялісты з Германіі, Англіі, Канады і расказвалі, як пастаўлена работа ў іх, мы толькі захапляліся. Але сёння гэтая рэальнасць прыйшла і на нашы палі. І гэты рост вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі адбыўся дзякуючы дальнабачнай арыентацыі кіраўніка дзяржавы і ўрада на тэхпераснашчэнне. За сем гадзін касілка КДН 2.1 касіць шэсць гектараў, а сучасны КПР-9 — 45! Адчуваеце розніцу? Або адзін чалавек такі аб'ём работы робіць, або восем. Вось што такое вытворчасць працы. Або камбайн, прапускная здольнасць якога была 4-5 кілаграмаў за секунду па хлебнай масе, а стала 15-16. Для сучасных камбайнаў патрэбна ўраджайнасць 40—60 цэнтнераў з гектара, тады ён выдае за дзень па 250—300 тон, а не 50. Нядаўна мы радаваліся ў гаспадарках тысячніку, а сёння трэба, каб кожны па тысячы на камбайн намалочваў. Для гэтага і патрэбны тэхналогіі. Будзе вытворчасць — будуць грошы.

У кожным раёне ёсць 2-3 гаспадаркі моцныя, ёсць сераднячкі і аўтсайдары. Найлепшыя адрозніваюцца высокім пераснашчэннем і высокай культурай захавання тэхналогій. Там і кадры ёсць. У першую чаргу павінны быць кіраўнікі. У Беларускай акадэміі ёсць рэзерв кадраў з найлепшых студэнтаў, іх з самага пачатку рыхтуюць на кіраўнікоў. Разам з іншымі ведамі яны атрымліваюць азы, як кіраваць сучаснай вытворчасцю, іх накіроўваюць на практыку ў найлепшыя гаспадаркі. Вялікая падтрымка для сяла — тэхніка ў лізінг. Многія гаспадаркі выжылі за кошт таго, што бралі тэхніку пад 2-3 % на сем гадоў. Праграма вельмі добрая, яе ні ў якім разе нельга згортваць.

Санкцыі нас прымушаюць паскорыцца. Дзесяць гадоў таму краіна імпартавала парадку 200 тысяч тон сартоў цвёрдай пшаніцы, сёння, магчыма, і 10 тон не завозім. Ужо ёсць свая. Тэхналогіі новыя з'явіліся, селекцыянеры вывелі больш уradлівыя сарты, сёння мы насеннем забяспечаны. І, мяркуючы па тых прадуктах, якія атрымліваем, якасным. Наш барысаўскі вытворца «Барымак» выдатную макаронную прадукцыю выпускае, лідская, клімавіцкая мука таксама на вышыні. І сваю тэхніку якасную навучымся рабіць, каб не аддаваць за яе валюту. Апошнія гомельскія камбайны нічым не горшыя за замежныя, але могуць стаць яшчэ лепшымі.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.
г. Горкі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Больш пляжаў, класы на вадзе і велапатрулі

На Гомельшчыне набірае абароты шырокамаштабная работа па прафілактыцы трагічных здарэнняў і парушэнняў правілаў бяспекі на вадзе. З пачаткам пляжнага сезона падраздзяленні МНС і супрацоўнікі таварыства ратавання на водах арганізоўваюць узмоцненыя рэйды. У рамках рэспубліканскай акцыі «Летні патруль» у кожным раёне вобласці да прафілактычных патрулёў далучыліся і актывісты БРСМ.

Асаблівая ўвага — месцам, прызначаным для купання, і тым, дзе плаваць катэгарычна забаронена. З сумнай статыстыкай не паспрачаешся: менавіта на «дзікіх» пляжах штогод фіксуюцца выпадкі гібелі людзей. Летась на Гомельшчыне ў месцах стыхійнага адпачынку патанулі 25 чалавек. Практычна ўсе трагедыі здарыліся там, дзе нельга было купацца. Сёлета ў вобласці патанулі ўжо 20 чалавек, з іх двое непаўналетніх, выратавана 36 чалавек, з іх восем дзяцей.

Сумную статыстыку трагедый на вадзе агучылі на нарадзе з удзелам службаў ЖКГ, саннагляду, таварыства ратавання на водах і праваахоўнікаў у Гомельскім

Рэспубліканская акцыя «Летні патруль» у Добрушы.

аблвыканкаме. На кантролі — гатоўнасць пляжаў да купальнага сезона. Як вядома, сёлета ў рэгіёне гэтую работу моцна ўскладніла паводка. Між тым кіраўніцтва вобласці перад адказнымі службамі паставіла задачу забяспечыць поўны парадак і бяспеку на ўсіх вадаёмах у самыя кароткія тэрміны. Як адзначыў намеснік старшыні аблвыканкама Уладзімір Прывалаў, неабходна ўлічыць, што па аб'ектыўных прычынах многія жыхары рэгіёна правядуць водпускі не за мяжой, як у ранейшыя гады, а ў родных месцах. Прынята рашэнне ў рэгіёне гэтым летам дадаць дзевяць камунальных пляжаў і ўвесці дадатковыя ратавальныя пасты.

Праваахоўнікі звяртаюць увагу: пераважная большасць патанулых знаходзілася ў стане алкагольнага ап'янення, што не дазволіла рэальна ацаніць небяспеку.

Як адну з новых форм кантролю за правапарадкам, у тым ліку ў прыбярэжнай зоне, гомельскія праваахоўнікі арганізавалі велапатрулі.

На Гомельшчыне прынята рашэнне пашырыць леташнюю практыку навучання плаванню дзяцей на адкрытых вадаёмах. У мінулым годзе да пілотнага праекта на 11 гарадскіх пляжах змаглі далучыцца амаль 1850 дзяцей. Сёлета плануецца арганізаваць заняткі на 21 пляцоўцы.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Аляксандр РАДЗЬКОЎ:

«АБ ЛЮДЗЯХ ПІСАЦЬ КОЖНЫ ЧАЛАВЕК —

На старонках «Звязды» вось ужо колькі часу друкуюцца ўрыўкі з кнігі «Рэктары», аўтар якой — вядомы грамадскі дзяяч, палітык, педагог, вучоны Аляксандр Радзькоў. На яго рахунку як навукоўца — мноства падручнікаў і дапаможнікаў па матэматыцы для ВНУ і школ. А кніга «Рэктары» — чацвёртая ў пісьменніцкай кар'еры, да гэтага пабачылі свет выданні «Дыскрэтны падыход да назірання жыцця», «Мой фізмат» і «Маленькія гісторыі вялікай сям'і». У мінулым годзе Аляксандр Міхайлавіч стаў лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі. Размова пра літаратуру з палітыкам, матэматыкам і літаратарам у адной асобе дае магчымасць для асабліва філасофскага ракурсу.

— Сёння ў свеце існуюць дзве супрацьлеглыя тэндэнцыі... З аднаго боку, людзі імкнуцца як мага хутчэй засвойваць інфармацыю, чытаць як мага больш паскорана, для чаго прапануюцца розныя курсы хуткачытання. З другога боку, усё большую папулярнасць набывае тэорыя маруднага чытання — калі мастацкі тэкст успрымаецца на глыбінных узроўнях, калі ацэньваецца стыль пісьменніка, аналізуюцца закладзеныя алюзіі і сэнсы... Існаванне дзвюх такіх тэндэнцый паралельна заканамернае? Якому чытанню вы аддаяце перавагу — хуткаснаму, маруднаму, геданістычнаму, аналітычнаму? І ці не страчана сёння большасцю культура чытання — калі чытач атрымлівае асалоду ад прыгажосці тэксту, ад стылю, ад асаблівай метафары?

— Кожны чалавек уладкоўваецца ў жыцці, знаходзіць сваё месца ў людской супольнасці ў адпаведнасці са сваімі жаданнямі і пад уплывам абставін, якія для яго склаліся. І тут шмат залежыць ад прыроджаных здольнасцяў, выхавання ў сям'і, навакольнага асяроддзя. У выніку ў кожнага чалавека складаецца свая траекторыя развіцця: школа, ПТВ, каледж, універсітэт, аспірантура. Адсюль працоўная прафесія, інжынерныя ці тэхналагічныя распрацоўкі, навучанне ці лячэнне людзей, мастацкая творчасць ці навуковыя пошукі. І на гэтым шляху чалавек набывае і ўдасканальвае свае навыкі чытання, у тым ліку мастацкай літаратуры.

Мой калега па Магілёўскім універсітэце, разумнік-фізік, дацэнт Віктар Іосіфавіч Веракса, з якім мы заўсёды абмяркоўвалі навінкі сучаснай мастацкай літаратуры, будучы ўжо ў сталым узросце, неяк сказаў:

— Раней я чытаў усё запар, потым стаў кнігі для чытання выбіраць, потым стаў чытаць толькі навуковую літаратуру па спецыяльнасці, потым чытаў толькі тое, што сам напісаў, а зараз увогуле нічога не чытаю!

На мой погляд, хуткасць чытання, глыбіня пранікнення ў напісанае, ступень аналізу аўтарскага тэксту шмат у чым залежыць ад мэт, з якімі чытач узяў у рукі кнігу, ад яго агульнай культуры і прафесійнай падрыхтоўкі, ад імгненных і стратэгічных жаданняў, ад спецыфікі самога гэтага выдання. Пры гэтым вольна ці мімаволі мы падвяргаемся ўплыву сучасных форм і метадаў падачы інфармацыі, у тым ліку мастацкіх вобразаў. Таму наўрад ці сучасны чытач у большасці сваёй будзе смакаваць, напрыклад, падрабязнае апісанне ў кнізе прыгажосці прыроды. Ён гэтыя карцінкі разгледзіць на экране камп'ютара ва ўсіх колерах і ў розных ракурсах. Але ж заўсёды знойдуцца аматары, няхай і нямногія, дадумаць успрыманне навакольнага свету разам з аўтарам кнігі, паглядзець на рэчаіснасць яго вачыма. І потым, філасофію падаючага восенню з дрэва лістка можна перадаць толькі друкаваным тэкстам, як гэта мог рабіць Канстанцін Паўстоўскі.

— Прачытала ў сучаснага філосафа Ена Багоста разважанні, што пісьменніцтва — адзіная форма навуковай прадукцыйнасці, бо кар'ерныя дасягненні навукоўца вымяраюцца колькасцю яго кніг і артыкулаў, але пры гэтым іх друкуюць і выдаюць не для таго, каб іх прачыталі, а таму, што іх напісалі. То-бок яны застаюцца ў вузкім коле спецыялістаў. У той час як літаратура мастацкая ствараецца менавіта для чытача і яе каштоўнасць залежыць ад чытацкага рэзанансу, для пісьменніка важны найперш эстэтычны складнік. Вы — аўтар і навуковых тэкстаў, і літаратурных... У чым для вас розніца? І ці можа быць каштоўнай кніга, якая не мае чытача? І, наадварот, наколькі часта раскручаны бестселер не вытрымлівае праверкі чытацкім густам і часам?

— У чалавецтва ёсць тры спосабы спазнання навакольнага свету — навуковыя даследаванні, мастацкі вобраз і рэлігійная вера. Навука мае на ўвазе сістэмныя назіранні, эксперымент, матэматычнае абгрунтаванне, строгую логіку правіл атрымання вынікаў і высноў. Гэта ў большай ступені рацыянальны складнік спазнання. Але ёсць і ірацыянальны, у прыватнасці інтуітыўны, эмацыянальны. Вось гэты бок вывучэння рэчаіснасці шмат у чым забяспечваюць праз мастацкі вобраз мастакі, музыкі, пісьменнікі. А што мы пакуль не ў стане зразумець, прымаем на веру, адносім да кампетэнцыі Бога. Чытанне навуковай літаратуры патрабуе грунтоўнай спецыяльнай падрыхтоўкі. А падрыхтоўка да публікацыі навуковага артыкула ці манаграфіі — гэта таксама від навуковай працы. Трэба ж папярэдне сістэматызаваць атрыманыя падчас даследаванняў вынікі, выявіць тыя, якія прадстаўляюцца новымі, правільна іх выказаць. Таму любы вучоны абавязкова будзе і публікавацца, і вывучаць навуковую літаратуру. І тое, і іншае ўваходзіць і ў яго прафесійныя інтарэсы, і ў навуковы абавязак. Навукоўцаў у грамадстве не так ужо і шмат. Фанатычных вернікаў — таксама. Таму кола тых, хто стала і з непадробнай цікавасцю чытае навуковую і рэлігійную літаратуру, не такое ўжо і вялікае. А вось мастацкую літаратуру чытаюць усе! І хоць у ёй даследуюцца гэткія маштабныя праблемы і катэгорыі, як, напрыклад, вайна і мір, злачынства і пакаранне, каханне і нянавісць, рэвалюцыя і эвалюцыя, данскія казакі і палешукі, лаліты і абломавы, яны падаюцца вобразна, эмацыянальна, шмат у чым асобасна, таму шматлікіх чытачоў і захапляюць. Не ўсе навуковыя публікацыі прадстаўляюць перспектыўныя навуковыя напрамкі і прад'яўляюць прадукцыйныя вынікі, і не ўсе мастацкія кнігі становяцца бестселерамі. Але і тыя, і іншыя — вынікі творчага пошуку, чарговых спроб і памылак на шляху спазнання навакольнага свету. І гэтыя вынікі заўсёды будуць запатрабаваны, колькі б яны ні каштавалі.

— Постіндустрыяльная эпоха — гэта свет рэчаў... На жаль, рэч, дакладней, магчымасць валодаць ёю, з'яўляецца мэтай жыццядзейнасці чалавека эпохі спажывання. Больш за тое — існуюць філасофскія тэорыі, згодна з якімі рэч валодае свядомасцю, апелююць, зразумела, найперш да віртуальнага свету, штучнага інтэлекту. Як супрацьстаяць такому светапогляду? Як пераадолець у свеце навязлівай рэкламы «інстынкт спажыўца»? Супрацьстаяць уніфікацыі? І што такое ў вашае ацэнцы штучны інтэлект — ці сапраўды ён можа канкурыраваць з чалавекам? Ці кіраваць ім?

